Свята ў хату!

# СУКВЕЦЦЕ ТАЛЕНТАЎ

## Мінскі абласны фестываль нацыянальных культур прайшоў у Маладзечне

**На Міншчыне пражываюць 130 нацыянальнасцяў і народнасцяў. З 1996-га раз у два гады ў цэнтральным рэгіёне праводзіцца абласны Фестываль нацыянальных культур. За гэты час ён стаў сімвалам духоўнасці і яднання. Чарговы, трынаццаты, раз мерапрыемства прайшло ў Маладзечне. У гарадскім Доме культуры сабраліся прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў Мінскай вобласці. Усе, хто шануе родную мову, захоўвае традыцыі і звычаі, што дасталіся ад прашчураў. Фестываль можна назваць святам адзінства, дружбы і згоды. Кожны з удзельнікаў сваім талентам, творчасцю абагачае не толькі сваю самабытную культуру, але і ў цэлым культуру Беларусі.**


kraj.by

— Фестываль праводзіцца ў мэтах гарманізацыі міжнацыянальных адносін, папулярызацыі найлепшых узораў паэтычнай, музычнай, харэаграфічнай творчасці, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва нацыянальных супольнасцяў. Дапамагае даследаваць пераемнасць нацыянальных мастацкіх традыцый, умацоўвае творчыя і дзелавыя стасункі паміж установамі культуры і грамадскімі культурна-асветніцкімі арганізацыямі нацыянальных суполак, — расказала **дырэктар Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці Ірына ПАЗНЯК.**

У свяце прынялі ўдзел майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, творчыя калектывы і індывідуальныя выканаўцы з розных куткоў Міншчыны. Сярод іх — прадстаўнікі асветніцкіх аб'яднанняў украінцаў «Краяны» з Маладзечна, «Обрый» з Мінскага раёна, Беларускага грамадскага аб'яднання ўкраінцаў «Ватра», народнага аматарскага аб'яднання нацыянальных культур «Шматгалоссе» Печынскага дома культуры Барысаўскага раёна, культурна-асветніцкага грамадскага аб'яднання «Саюз палякаў на Беларусі» з Нясвіжа, Стоўбцаў і Івянца, цыганскі ансамбль «Эльпіс» са Слуцка, асобныя выканаўцы армянскай, яўрэйскай, азербайджанскай, узбекскай дыяспар і іншыя.

— Цудоўныя калектывы, цудоўныя асобы, дуэты, ансамблі, — адзначыў **мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага хору імя Г. Цітовіча Міхаіл ДРЫНЕЎСКІ.** — Гэты фестываль патрабуе ад удзельнікаў сапраўднага майстэрства.

На думку **старшыні Беларускага фонду культуры Уладзіміра ГІЛЕПА,** гэта адзін з самых брэндавых фестываляў Беларусі, а можа нават самы брэндавы. Ён выгадна прадстаўляе нашу краіну на фоне іншых краін. Ён шматнацыянальны і спалучае ў сабе багацце розных нацыянальных культур.

У многім яны пераклікаюцца з беларускай культурай. Напрыклад, украінец без цяжкасцяў можа зразумець беларуса, а беларус — свайго суседа. Ды і песні беларусы і ўкраінцы пяюць аднолькавыя. Украінская дыяспара — адна з самых буйных у нашай краіне. Беларускае грамадскае аб'яднанне ўкраінцаў «Ватра» прапаноўвала ўдзельнікам і гасцям фестывалю знаёмства не толькі з народным мастацтвам, бытам і звычаямі свайго народа, але і дэгустацыю нацыянальных страў.

Вельмі цёпла і сардэчна прымалі на фестывалі народнае аматарскае аб'яднанне «Шматгалоссе», якое добра ведаюць не толькі на Барысаўшчыне, але і ва ўсёй Беларусі, і без удзелу якога не абыходзіцца ніводнае значнае мерапрыемства. Гэты калектыў у снежні адзначыць 17-годдзе з дня стварэння. А адметны ён тым, што сюды ўваходзяць прадстаўнікі дванаццаці нацыянальнасцяў. Асаблівасць аб'яднання яшчэ і ў тым, што яно ўключае некалькі кірункаў: творчасць паэтаў-песеннікаў, сольных выканаўцаў, народных майстроў, клуб аматараў нацыянальных кухняў.

Усе ўдзельнікі атрымалі дыпломы фестывалю і памятныя падарункі. Ну, а рэспубліканскае журы, якое працавала падчас мерапрыемства, праўдзе адбор калектываў і выканаўцаў для ўдзелу ў заключных мерапрыемствах Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, які па традыцыі праводзіцца ў Гродне ў пачатку чэрвеня.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

---

Zамор'е

## ☑ Хлопчык паступіў ва ўніверсітэт

**Дзевяцігадовае дзіця-вундэркінд з Бельгіі хутка стане бакалаўрам па спецыяльнасці электратэхніка, паведамляе CNN.**



Бацькі Ларана Сіманса спачатку не паверылі яго дзядулю і бабулі, якія сцвярджалі, што іх унук анамальна хутка вучыцца. Аднак калі хлопчык пайшоў у школу, яны зразумелі, што іх родныя не перабольшвалі. Настаўнікі давалі хлопчыку тэсты ўзроўняў розных класаў, каб ацаніць глыбіню яго ведаў, і ён спраўляўся з усімі заданнямі на выдатна.

Зараз вундэркінд вывучае электратэхніку ў Тэхналагічным універсітэце Эйндховена. Выкладчыкі называюць Сіманса «проста неверагодным» — ён атрымае ступень бакалаўра ў снежні. Кіраўніцтва ВНУ падтрымлівае талент хлопчыка і дазваляе яму складаць спецыяльны расклад, каб хутчэй скончыць вучобу. Затым ён планує атрымаць доктарскую ступень па электратэхніцы і «трохі вывучыць медыцыну». Хлопчыку прапануюць навучанне прэстыжныя ўніверсітэты з усяго свету, і яму трэба будзе вызначыцца, дзе атрымліваць доктарскую ступень.

Нягледзячы на выдатныя здольнасці Сіманса да навучання, яго бацькі імкнуцца, каб хлопчык паспяваў адпачываць і атрымліваў асалоду ад жыцця. Ён любіць гуляць са сваім сабакам і праводзіць час за гульнямі на тэлефоне, як і звычайныя дзеці.

## ☑ Мужчына выратаваў 1920 жыццяў сваёй крывёю

**Жыхар амерыканскага горада Пуэбла, што ў штаце Каларада, за 34 гады здаў 303 літры крыві, паведамляе сайт Unilad.**



Дэйв Махалік упершыню здаў кроў, калі маці яго сябра патрэбна было пераліванне. Амерыканец стаў пастаянным донарам: кожныя два тыдні ён ездзіць у бальніцу за 160 кіламетраў ад дому, каб ахвяраваць кроў. За 34 гады мужчына выратаваў 1920 жыццяў. Калі Махалік здаваў кроў 640-ы раз, яго ўзнагародзілі значком ганаровага донара. Амерыканец заявіў, што здаваць кроў увайшло ў яго ў звычку і падкрэсліў, што быць донарам можна нават ва ўзросце 70—80 гадоў. Паводле яго слоў, здаваць кроў і ратаваць жыцці людзей такім чынам — добрая справа для тых, хто не можа дазволіць сабе займацца дабрачыннасцю.

## ☑ Выйграў мільёны і... стаў шахцёрам

**Жыхар Вялікабрытаніі, які выйграў у латарэю 9,7 мільёна фунтаў стэрлінгаў, спусціў усе грошы на выпіўку і стаў шахцёрам. Аднак, як паведамляе The Mirror, цяпер ён адчувае сябе куды лепш.**



Мікі Кэрал купіў шчаслівы білет за адзін фунт у 2002 годзе, калі яму было 19. Тады ён жыў у англійскім графстве Норфалк і працаваў прыбіральшчыкам смецця. Яго жонка была на сёмым месяцы цяжарнасці.

Як толькі Кэрал даведаўся пра выйгрыш, ён аддаў мільён фунтаў стэрлінгаў сваёй маці, яшчэ адзін мільён — дзядзьку і цётцы, якія дапамагалі гадаваць яго пасля смерці бацькі. А калі мужчына пачаў траціць шмат грошай на забавы: выпіўку, наркотыкі і прастытутак, за дзень ён выпіваў не менш за дзве бутэлькі гарэлкі. З-за гэтага ад яго сышла жонка. Кэрал аддаў два мільёны фунтаў ёй і яе маці. Брытанец адзначыў, што з моманту выйгрышу вакол яго з'явілася мноства сяброў, і ён раскідваўся грашыма, каб іх уразіць. Некалькі разоў ён трапляў у суд з-за п'яных выхадак.

Калі Кэрал збяднеў, уся яго кампанія адвярнулася ад яго. Яму некалькі разоў пагражалі злачынцы і вымагальнікі. «Грошы — корань зла. Я зразумеў, што нельга давяраць нікому, нават сваёй чортавай сям'і», — падкрэсліў мужчына. У 2013 годзе ён пазбавіўся ўсіх грошай і дома. Яго адмаўляліся браць на работу з-за скандальнай рэпутацыі.

Цяпер Кэрал працуе шахцёрам у шатландскай акрузе Моры. Нягледзячы на тое, што мужчына праводзіць у вугальнай шахце шэсцьдзясят гадзін сем дзён на тыдзень, ён прызнаецца, што адчувае сябе шчаслівым, бо сумленна зарабляе на жыццё. Тым не менш ён адзначыў, што калі б яму далі магчымасць павярнуць час назад, ён бы не стаў нічога мяняць. «Гэта былі самыя вясёлыя і вар'яцкія дзесяць гадоў майго жыцця», — дадаў ён. Кэрал прызнаўся, што працягвае гуляць у латарэю.

**Іван КУПАРВАС.**

---

Спытайце пра радзіннае

# ЯК БЛАСЛАЎЛЯЦЬ МАЛАДЫХ?

**Пытанні, якія задалі нашы чытачкі Таццяна Пятроўна Р. з Мар'інай Горкі і Алена Мікалаеўна Ф. з Салігорска, у нечым падобныя: «Як правільна выканаць провады жаніха і нявесты, калі яны едуць у загс?» і «Калі нашы маладыя будуць вянчацца, якая ікона павінна ў іх быць?»**

Мы пастаянна падкрэсліваем, што так званы пераходны час і прастора, у межах якой разгортваюцца абрадавыя падзеі, уяўляюць сабой адкрытую структуру, абараняць якую і падтрымліваць жыццяздольную раўнавагу заклікані шматлікія абярэгі. Да шэрагу такіх абрадавых практык адносіцца і працяглы, складаны па сваёй цырыманіяльнай кампазіцыі вясельны абрад. Яго падзейная адкрытасць і безабароннасць памнажаюцца тым, што збіраецца вялікая колькасць гасцей, пастаянна мяняецца месца правядзення важных абрадавых дзеянняў, адначасова задзейнічана значная колькасць вясельных чыноў, за якімі стаяць людзі рознага ўзросту, полу, сацыяльнага статусу, ступені сваяцтва. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што якраз вясельны цырыманіял як ніякі іншы скіраваны ў аддаленую перспектыву (нароўні з ім можна паставіць толькі цыкл абрадаў, якія суправаджаюць нараджэнне дзіцяці). А калі ўлічыць, што маладым трэба было двойчы перадолець прастору дарогі, якая яшчэ ў большай ступені ўяўлялася небяспечнай для вясельнага поезда, то становіцца зразумелым, чаму момант адпраўлення маладых да вянца лічыўся адным з самых непрадказальных. Гэтая акалічнасць патрабавала ад удзельнікаў уключэння ў кантэкст провадаў дадатковых магічных дзеянняў прэвентыўнага характару. Як толькі жаніх і нявеста разам са сваёй дружынай зоймуць месцы ў вясельным картэжы, бацькі нявесты выконваюць рытуал, накіраваны на захаванне яго цэласнасці і непадзельнасці на ўсім шляху — ад дома да храма або загса і назад.

Бацька выносіў дамашнюю ікону, а ўслед за ім ішла маці, трымаючы ў руках засцеленае белым ручніком вечка дзяжы, на якім узвышалася міса, напоўненая жытам. Бацька і маці тройчы абыходзілі вакол вясельнага картэжу, рухаючыся па ходзе сонца, і абсыпалі яго зернем.

Сэнс гэтага святочна-велічнага рытуальнага дзеяння зводзіцца да двух аспектаў. З аднаго боку, трэба было «замкнуць» усіх удзельнікаў абраду (перш за ўсё тых, хто ў складзе вясельнага картэжу паедзе ў храм або загс) у сімвалічнае кола, якое на працягу ўсяго шляху не павінна было разарвацца ні пры якіх абставінах. Бацькі абносілі поезд іконай і тым самым узводзілі своеасаблівы рытуальна-магічны «кокан», які і павінен быў выконваць ролю надзейнага абярэга і не дапускаць пранікнення ў яго прастору чужа-РОД-най сілы.

Але пасля ўсіх выкананых рытуальных дзеянняў і ў хаце, і ў двары ікону абавязкова вярталі на ранейшае месца — на покуць, у чырвоны кут.

Тыя, хто сёння жадае вянчацца, павінны ведаць: для маладых, асабліва ў тым выпадку, калі яны будуць браць шлюб, загадзя набываюць два абразы: выяву Дзевы Марыі і выяву Ісуса Хрыста, якія «адпраўяцца» ў вясельную дарогу, будуць «прысутнічаць» у храме пры шлюбе, імі ж святар блаславіць маладых. З гэтага моманту іконы стануць сямейнымі святынямі гэтай сямейнай пары.

Вось тут хацелася б правесці адно невялікае, але прынцыпова важнае параўнанне. Замест таго каб сустрэць маладых на парозе роднай хаты, на непрацяглы час пасадзіць іх у чырвоным куце («прапісаць іх тут на доўгі сумесны век») і толькі пасля гэтага кіравацца да рэстарана, дзе будзе праходзіць святочная імпрэза, нашы сучасныя бацькі робяць усё наадварот. Яны сустракаюць жаніха і нявесту іконай перад парогам рэстарана, а пасля пакладуць яе ў які-небудзь пакеце проста на падлозе, дзе яна будзе ляжаць да завяршэння застолля. Дбайная гаспадыня ведае, што пакет прадуктаў не варта апускаць на падлогу, а тут самая вялікая святыня на нейкі час становіцца будзённай рэччу...

З галоўнай іконай храма ці хаты ў народзе заўсёды звязвалі будучыню. Так, калі яе з нейкіх прычын выносілі з храма, то гэта часцей за ўсё прадвяшчала яго разбурэнне і спусташэнне абіцелі. Калі хатні абраз выносілі з хаты і не вярталі, гэта прадказвала выміранне ўсяго Роду. Далей мяркуйце самі.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

*Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».*